Дзем'яновіч В.А., студ. гр. 214 ФТБКіСМ
БДУКМ
Навуковы кіраўнік – Гуцько В.Л.,
кандыдат культуралогіі

# ТЭНДЭНЦЫІ ЭКАСВЯТ У ШВЕЦЫІ І БЕЛАРУСІ

Экалагічнае свята ці экасвята – прамежак часу ў гадавым цыкле, які накіраваны на захаванне раўнавагі, узнаўлення гармоніі чалавека і біясферы Зямлі. Урачыстасць суправаджаецца узрушаным, радасным настроем удзельнікаў, якія ушаноўваюць каштоўнасці старажытнай культуры – свяшчэнныя дрэвы, татэмныя жывелы і рэдкія жывыя арганізмы. Экасвяты можна размежаваць па характару правядзення: 1 – прафесійныя святы (свята працаўнікоў лесу ў Расіі, Беларусі, Украіне; свята працоўнікоў Міністэрства экалогіі і прыродных рэсурсаў у Азербайджане і інш.); 2 – святы, разлічаныя на захаванне прыродных рэсурсаў і узнаўленне раўнавагі ў прыродных комплексах (сусвеная гадзіна Зямлі, фестываль ракаў у Мальма, акцыя – дзень без аўтамабіля 22 верасня); 3 – святы, дзе ўзнаўляецца гармонія ўзаемаадносін прыроды (стыхій, жывых істот) і чалавека, якія не звязаны з язычніцкім земляробчым календаром (свята селядца з непрыемным пахам у Швецыі).

Разгледзім прыклады экасвят у двух краінах – Швецыі і Беларусі. Клімат краін подобны і ў кожнай з іх па-рознаму надаецца ўвага мерапрыемствам экалагічнага накірунку.

Штогадовае свята зімы праходзіць на поўначы Швецыі. У гэты час распаўсюджаны гонкі на аленях, на сабачых запрэжках, чэмпіянат па стварэнню скульптур са снегу, у якім прымаюць удзел 60 мастакоў – і усё гэта праходзіць у шведскім горадзе Кіруна ў канцы студзеня. Расчыняе свае дзверы знакаміты Ледзяны гатэль. З лёду тут усё: сцены, вокны, радыёпрыёмнікі і шклянкі ў бары. Адпачываць пастаяльцам прапануюць на ледзяных ложках, засцеленых скурай аленя. Гатэль складзены з адмысловага,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

экалагічна чыстага блакітнага лёду. Зимовае свята падкрэслівае экалагічны напрамак гарманічнага суіснавання чалавека ў прыродзе.

30 красавіка пачынаецца летні сезон на плошчы у цэнтры Стакгольма, дзе размешчана найбуйнейшая муніцыпальная сцэна горада. На плошчы высаджана мноства дрэў сакуры – японскай вішні. Падчас правядзення свята яна квітнее некалькі дзён, афарбоўваючы ўсю плошчу ў ружовы колер. Дзень сакуры прысвечаны японскай культуры – у праграме чытанне хоку, японскі тэатр і музыка. Экасвята стала яркім дапаўненнем традыцыйнага святкавання дня нараджэння караля Швецыі, які адбываецца таксама ў гэты дзень.

Другая палова жніўня – наступная падстава для святкавання. Гэта час, калі заканчваецца забарона на лоўлю ракаў у вадаёмах. У даўніну шведам, аматарам ракаў, закон дазваляў лавіць і есці іх усяго два месяцы ў годзе – у жніўні і верасні. Самая грандыёзная ў Скандынавіі вечарынка Kräftskiva (у перакладзе “ракі пры святле поўні”) праходзіць у Мальмё. На працягу тыдня ладзяцца феерверкі, спартыўныя мерапрыемствы, тэатральныя і музычныя прадстаўленні, шоў, разнастайныя канцэрты, парады, дзіцячыя атракцыёны, частаванне нацыянальнымі і экзатычнымі стравамі. У першы дзень пры змярканні накрываецца стол пад адкрытым небам або на тэрасе. Кожны госць атрымлівае пры ўваходзе папяровыя капялюш і фартушок. Галіны дрэў упрыгожваюцца папяровымі ліхтарыкамі.

Наступнае экасвята – гэта свята селядца з непрыемным пахам, якое адзначаецца ў апошні дзень жніўня. Так званы селядзец з’яўляецца далікатэсам у шведаў. Гісторыя паходжання рыбнага далікатэсу налічвае звыш пяцісот год. У тыя часы соль у Швецыі каштавала вельмі дорага, і аднойчы на адным з астравоў для засолкі рыбы не хапіла солі. У выніку салака ў кадушцы збрадзіла, і людзі, якія яе пакаштавалі, адчулі вельмі арыгінальны смак у незвычайнай “засолцы” селядца. Такім чынам у Швецыі з'явілася традыцыя і нават свята, прысвечанае сюрстрэммінгу. Кансервы з сюрстрэммінгам адкрываюць толькі пад вадой, каб зраўнаваць ціск, затым добра прамываюць пад вадой з крана і падаюць да стала.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Экасвяты шырока распаўсюджаны ў беларускай краіне. Штогод у рэспубліцы адбываюцца экалагічныя, фальклорна-экалагічныя форумы, святы і фэсты. Іх правядзенне з'яўляецца падставай для таго, каб звярнуць увагу на праблемы навакольнага асяроддзя ў Беларусі. Напрыклад, у 2004 годзе быў праведзены Першы Экалагічны фестываль у горадзе Свіслачы, дзе адбылося свята лесу. Сцэнарый масавага тэатралізаванага свята лесу быў распрацаваны П.А.Гудам і Н.І. Гуд. Месца правядзення было выбрана невыпадкова. Амаль палову тэрыторыі раёна займаюць лясы, дзе знаходзіцца трэцяя частка буйнейшага запаведніка краіны – Нацыянальнага парку "Белавежская пушча".

У 2011 годзе Экалагічны фестываль доўжыўся тры дні. У першы дзень заклалі алею ў гонар абласнога экалагічнага фестывалю на тэрыторыі мемарыяльнага комплексу "Асілак", што на ўскраіне Свіслачы. Кульмінацыяй свята сталі мерапрыемствы ў гарадскім парку, якія пачаліся тэатралізаванай кампазіцыяй "Запаведны напеў". У старажытным парку, які заклаў на пачатку XIX стагоддзя ўладальнік Свіслачы Вінцэнт Тышкевіч, працавала дзесяць фестывальных пляцовак. Асаблівую цікавасць гасцей выклікала "Гасцінная леснічоўка". Сімвалічна, што на тэрыторыі былой канторы была арганізавана "Леснічоўка", дзе можна было пабачыць прадукцыю другаснага выкарыстання – мётлы, венікі для лазні, дары лесу – брусніцы, журавіны, мёд, які быў сабраны з разнатраўя, а таксама саджанцы дэкаратыўных кустарнікаў. Цікавасць выклікаў прафесійны конкурс лесарубаў, які доўжыўся некалькі гадзін. Рубілі асобныя дрэвы, якія затым пайшлі ў прамысловую апрацоўку. На "кірмашы", які размясціўся на прасторнай пляцоўцы, можна было пазнаёміцца з прадукцыяй Свіслацкай фабрыкі лазовай мэблі і іншых вытворцаў. Свае вырабы на лясны кірмаш выставілі і народныя майстры. У межахляснога кірмашу на пляцоўках "Паляўнічая" і "Рыбацкая" можна было пачаставацца духмянай юшкай і дзічынай проста з вогнішча.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Карыстаецца вялізнай папулярнасцю і правядзенне Свята бульбы. На пачатку кастрычніка 2011 года свята адбылося ў вёсцы Дзераўная, што на Слонімшчыне. Госці і жыхары вёскі пачулі не толькі гісторыю пра бульбу, але і самі змаглі паўдзельнічаць у цікавай гульнёвай праграме з песнямі-прыпеўкамі, вершамі і танцамі.

Пасля разгляду і абагульнення экасвят у Швецыі і Беларусі, прыходзім да думкі, што экасвяты – неабходны накірунак святочнай дзейнасці рэжысёраў, які патрабуе грунтоўнай распрацоўкі метадалагічнай базы і арганізацыйнай дзейнасці па правядзенню мерапрыемстваў. Пры параўнанні тэндэнцый правядзення экасвят у Швецыі і Беларусі можна вызначыць некалькі значных адрозненняў:

- экасвята ў шведаў цесна звязана з вобразам жыцця і светаўспрыманнем (на свяце селядца з непрыемным пахам падкрэсліваецца ідэя аб тым, што нічога нельга выкідваць, усе прадукты можна спажываць);
- эмблемы на фестывале ракаў кожны год прапагандуюць не толькі думку аб захаванні папуляцыі ракападобных у вадаёмах, але і прапагандуюць сацыяльназначныя і геданістычныя каштоўнасці грамадства, што прываблівае моладзь – культ маладой сям’і, каханне, радасць жыцця, пацалунак і інш.
- незвычайнае выкарыстанне прыродных рэсурасаў дапамагае ўзнавіць гармонію чалавека і прыроднага наваколля – бег на санках у сабачых упрэжках, ледзяны гатэль і г.д.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Спіс выкарыстаных крыніц:

1. Гуд, Пётр Адамавіч. Свята лесу "Гамоняць пушчы беларускія..." : творчая заяўка і агульны сцэнарый масавага тэатралізаванага свята лесу / П. А. Гуд, Н. І. Гуд. – Гродна : [б. в.], 2006. – 24 с. – На вокл. аўт. не ўказаны.

2. Экологические праздники [Электронный ресурс] Режим доступа: http://www.calend.ru/holidays/ecology. – Дата доступа: 25.03.2012.

3. Раманчук, Галіна. У Свіслачы адбыўся абласны экалагічны фестываль [Электронны рэсурс] // Гродзенская праўда. – Рэжым доступа: http://www.grodnonews.by/ru/0/9087/news. – Дата доступа: 25.03.2012.

4. Раманчук, Галіна. Свята бульбы ладзілі на Слонімшчыне [Электронны рэсурс] // Гродзенская праўда. – Рэжым доступа: http://www.grodnonews.by/ru/0/9087/news. – Дата доступа: 25.03.2012.

5. Праздники и традиции Швеции [Электронный ресурс] Режим доступа: http://www.calend.ru/holidays/sweden. – Дата доступа: 25.03.2012.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ